# АСОБА Ў МУЗЫЧНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ: ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ

***М.Л. Кузьмініч,***
***Мінск, Рэспубліка Беларусь***

Музычна-адукацыйная прастора – гэта тая частка знешняга свету, які спецыфічным чынам адлюстраваны ў творах музычнага мастацтва і праз органы пачуццяў судакранаецца са свядомасцю суб'екта музычнай адукацыі, успрымаецца, запамінаецца, асэнсоўваецца (пранікае ва ўнутраны свет).

Як адзначае М.Ц. Грамкова, акаляючы суб'екта цэласны свет складаюць прыродная сфера, сацыяльная сфера і духоўная прастора ў іх адпаведнасці, раўназначнасці і гармоніі [1]. Уся разнастайнасць быцця чалавека ўвасабляецца ў музычным мастацтве. Яго інтанацыйны змест таксама адпавядае структуры навакольнага свету, адлюстроўвае ўсю сукупнасць сувязей чалавека з прыродай, з грамадствам, духоўнай прасторай. Успрымаючы творы музычнага мастацтва, чалавек фарміруе свой унутраны вобраз. У адпаведнасці з элементамі знешняга свету (прырода, соцыум, духоўнасць) у іх адзінстве і цэласнасці суб'ект музычнай адукацыі фарміруецца як складаная сістэма, якая выступае як індывід (суб'ект як прадстаўнік прыроднай сферы), асоба (суб'ект як прадстаўнік сацыяльнай сферы) і чалавек (суб'ект як прадстаўнік духоўнай сферы). Музычна-адукацыйная прастора становіцца важнейшым фактарам агульнага, усебаковага, гарманічнага развіцця чалавека, змянення яго ўнутранага вобраза пад уплывам музычнага мастацтва.

Гэты працэс адбываецца ўсюды і на працягу ўсяго жыцця чалавека. Ён забяспечвае асэнсаванне суб'ектам навакольнага свету і ўзаемадзеяння з ім, асэнсаванне ўласных дзеянняў, у выніку чаго адбываюцца змены ў яго свядомасці – у патрэбнасцях, у вопыце, здольнасцях. Змяненне ўнутранага вобраза чалавека накіравана на забеспячэнне гарманічнага існавання суб'екта адукацыі з навакольным светам. Такім чынам, музычная адукацыя як працэс асэнсавання акаляючага свету ў музычных творах, у розных відах і формах музычна-творчай дзейнасці і сябе ў гэтым свеце існуе столькі, колькі існуе музыка і чалавек з развітой свядомасцю.

Успрыманне музычнага мастацтва, яго адукацыйны ўплыў шмат у чым залежыць ад узроўню развіцця музычных здольнасцей суб'екта музычнай адукацыі, ад засваення і асэнсавання мовы музычнага мастацтва. Асэнсаванне знешняга свету і сябе ў ім адбываецца з удзелам ці без удзелу педагогаў-прафесіяналаў. Але менавіта педагог-музыкант забя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спечвае мэтанакіраванае развіццё музычных здольнасцей, засваенне мовы музычнага мастацтва, набыццё вопыту музычнай творчасці, вопыту ў розных відах і формах музычнай дзейнасці, а таксама музычных інтарэсаў, патрэбнасцей, эстэтычных густаў і ідэалаў.

Гэта прыводзіць да пэўных вынікаў, якія залежаць ад жыцця, рэчаіснасці, рэалій, ад асаблівасцей пэўнай гістарычнай (мастацкай, цывілізацыйнай, фармацыйнай і г. д.) эпохі. Яны шмат у чым вызначаюць характэрныя рысы музычна-адукацыйных працэсаў, якія забяспечваюць фарміраванне ўнутранага вобраза суб'екта музычнай адукацыі. Гэты ўнутраны вобраз ёсць музычная культура асобы, як частка агульнай духоўнай культуры. Асэнсаванне музычнай культуры асобы як трыадзінства музычнай навучанасці, выхаванасці, развітасці чалавека дае ключ да асэнсавання адукацыйных працэсаў, якія адбываліся ў розныя гістарычныя эпохі, у розных краінах і цывілізацыях, у лоне розных канфесій, сацыяльных страт і пластоў музычнай культуры.

Такім чынам, музычная адукацыя як працэс – гэта працэс змянення ўнутранага вобраза суб'екта адукацыі ў адпаведнасці з музычна-адукацыйнай прасторай. Яго развіццё адбываецца ўсюды і заўсёды як асэнсаванне самога сябе, знешняга свету і іх адзінства і непадзельнасці. У адукацыйных працэсах адбываецца змена свядомасці чалавека і таму адукацыйны працэс можна вызначыць як свядомае ўзаемадзеенне суб'екта з акаляючым яго светам. Сутнасць музычна-адукацыйнага працэсу – змяненні ў свядомасці, якія адбываюцца пры ўзаемадзеенні чалавека з музычным мастацтвам, а праз яго – з навакольным светам. Каналамі ўзаемадзеення з'яўляюцца эмоцыі, інтэлект і воля, а асноўнымі сродкамі – музычна-эстэтычныя і псіхаматорныя музычныя здольнасці. Вынікам працэсу ўзаемадзеяння суб'екта адукацыі з музычным мастацтвам і навакольным светам з'яўляецца змяненне яго ўнутранага вобраза, змяненне свядомасці. А змяненне свядомасці ў педагагічным працэсе – гэта змяненне патрэбнасцей (забяспечваецца праз музычнае выхаванне), норм (забяспечваецца праз музычнае навучанне), здольнасцей (забяспечваецца праз музычнае развіццё). Іншымі словамі, вынікам працэсу ўзаемадзеяння суб'екта адукацыі з музычным мастацтвам з'яўляецца дасягнуты ўзровень музычнай адукаванасці гэтага суб'екта.

Адукацыйныя працэсы шмат у чым вызначаюць дынаміку развіцця грамадства. На пэўным этапе яго развіцця ўзнікла педагогіка (XVII ст.) як вынік асэнсавання сутнасці адукацыйных працэсаў і імкнення свядома кіраваць імі ў інтарэсах грамадства. Педагогіка – навука аб спецыяльна арганізаваных адукацыйных працэсах, якія называюцца педагагічнымі. Таму яе аб'ектам з'яўляецца адукацыйны працэс (адукацыя як працэс),



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а прадметам – узаемадзеенне педагога і навучэнцаў у педагагічным працэсе. Педагагічны працэс – спецыяльна арганізаваны спецыялістамі ў спецыяльных умовах (у навучальных установах) адукацыйны працэс змянення ўнутранага вобраза суб'екта адукацыі. Педагогіка музычнай адукацыі – адгалінаванне прафесійнай педагогікі, якая вывучае заканамернасці спецыяльна арганізаваных музычна-педагагічных працэсаў фарміравання ўнутранага вобраза суб'екта адукацыі ў музычна-адукацыйнай прасторы.

Музычна-адукацыйныя працэсы могуць насіць як стыхійны, так і арганізаваны характар. Прамежкавае становішча займаюць працэсы музычнай самаадукацыі, якія, з аднаго боку, праяўляюцца як унутраная самастойная актыўнасць суб'екта адукацыі, а з другога – як апасродаванае кіраванне працэсам музычнай самаадукацыі з боку прафесіяналаў – педагогаў-музыкантаў. З гэтых пазіцый навуковы інтарэс уяўляе параўнальнае даследаванне сучаснай музычна-адукацыйнай прасторы і, напрыклад, музычна-адукацыйнай прасторы беларускага грамадства XVIIIст. ці XIX – пачатку XX ст. Прыкладам такога даследавання могуць служыць даследаванні В.У. Дадзіёмавай, А.Л. Капілава і А.І. Ахвердавай, М.Л. Кузьмініча, В.П. Пракапцовай і інш. Пры гэтым музычна-адукацыйная прастора грамадства выступае ў кантэксце развіцця музычнай культуры беларускіх гарадоў XVIII ст. [2] ці XIX ст. [3] у сувязі з развіццём мастацкай адукацыі на беларускіх землях ад вытокаў да сярэдзіны XX ст. [4] як важнейшая перадумова развіцця музычнага мастацтва [5]. Як правіла, у цэнтры ўвагі даследчыкаў з'яўляюцца не толькі навучальныя установы і арганізацыі музычнай адукацыі, не толькі музычна-адукацыйныя працэсы як феномен грамадскага жыцця пэўнай гістарычнай эпохі, але і асобы музыкантаў. Яны могуць быць прафесіяналамі ці аматарамі, магнатамі ці прыгоннымі сялянамі, людзьмі, якія свядома засвойваюць мову музычнага мастацтва і развіваюць свае музычныя здольнасці, ці выпадкова падпадаюць пад уплыў музычнага мастацтва, якое выступае як гукавы фон, як сродак атрымання эстэтычнай асалоды, рэлаксацыі ці тэрапіі, як зброя, «наркотык», спосаб схавацца ад знешняга свету, як сродак ідэалагічнага, маральнага выхавання падрастаючага пакалення і г. д.

Увогуле вылучаюць вялікую колькасць функцый музычнага мастацтва ў грамадстве. Функцыя адукацыі чалавека, фарміравання яго ўнутранага вобраза знешняга свету – адна з іх. Музыка не толькі сама ўбірае ў сябе дух эпохі, яна дазваляе кожнаму чалавеку ўвабраць у сябе гэты дух, часта на ўзроўні падсвядомасці, на ўзроўні эмоцый і пачуццяў. Даступнасць музычнага мастацтва, яго распаўсюджанасць у грамадстве,

увага з боку чалавека да разнастайных форм музычнай творчасці, дзейнасці, камунікацыі ператварае яго ў дзейсны сродак педагагічнага ўздзеяння на соцыум з улікам трансфармацыі сістэмы музычнай адукацыі ў сучасным беларускім грамадстве.

### *Літаратура*


1. *Громкова, М.Т.* Психология и педагогика профессиональной деятельности / М.Т. Громкова – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2003. – 415 с.
2. *Дадиомова, О.В.* Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII веке / О.В. Дадиомова. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 207 с.
3. *Капилов, А.Л.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков / А.Л. Капилов, Е.И. Ахвердова. – Минск: Институт современных знаний, 2000. – 144 с.
4. *Пракапцова, В.П.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі / В.П. Пракапцова. – Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999. – 210 с.
5. *Кузьмініч, М.Л.* Музычная адукацыя ў XIX – пачатку XX ст. / М.Л. Кузьмініч. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 271 с.


## НАРОДНОЕ МУЗЫКАЛЬНОЕ ПРОИЗВЕДЕНИЕ «ЦВЕТУЩАЯ ЛУННАЯ НОЧЬ НА РЕКЕ ЧУНЬЦЗЯН» КАК ОТРАЖЕНИЕ ВЗАИМОСВЯЗИ МУЗЫКИ И ЖИВОПИСИ В ТРАНСКРИПЦИЯХ ДЛЯ ПИПЫ И ОРКЕСТРА


***Лю Ян, Китай***


В истории развития мирового искусства музыка и живопись представляют собой два его основных вида, зачастую проникающие друг в друга. Хотя музыка – это искусство, воспринимаемое на слух, нередко она вызывает у слушателя ассоциации, трансформирующиеся в воображении в визуальные образы. Вне всяких сомнений, звук представляет собой материальное средство музыки, музыкальные смыслы невозможны без звуков, которые люди путем ассоциаций соединяют с воображаемыми зрительными образами. Каждый элемент музыкального произведения позволяет с помощью набора приемов и средств создать представляемую слушателями «картину». Характеры персонажей, образы животных, природные пейзажи, место действия и т. п. – всё это позволяет «нарисовать» звучание. Издревле и повсеместно изобразительная функция музыки используется и развивается композиторами во всей своей полноте. В этом смысле в качестве классического примера можно


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ